ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
06.11.2024 № 487

# Білеты
# для правядзення экзамену ў парадку экстэрнату
# пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы
# базавай адукацыі
# па вучэбным прадмеце «Геаграфія»

2024/2025 навучальны год

## УКАЗАННІ ДА БІЛЕТАЎ

Пры правядзенні экзамену па вучэбным прадмеце «Геаграфія» асаблівую ўвагу трэба звяртаць на разуменне заканамернасцей прыроды, узаемасувязей грамадства і прыроды, ролі геаграфічных ведаў у вырашэнні сацыяльна-эканамічных і экалагічных праблем, уменне карыстацца картаграфічнымі выданнямі. Важна праверыць веды вучняў аб геаграфічных асаблівасцях прыроды, насельніцтва і гаспадаркі свету, мацерыкоў і асобных краін зямнога шара і Рэспублікі Беларусь.

*Першае* і *другое* пытанні білетаў ахопліваюць асноўны тэарэтычны матэрыял па геаграфіі. У *трэцім* пытанні сфармуляваны заданні на праверку ўмення ўжываць веданне тэорыі на практыцы. Практычныя заданні складаюцца настаўнікам.

### Білет № 1

1. Фізіка- і эканоміка-геаграфічнае становішча Рэспублікі Беларусь. Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел краіны.
2. Геаграфія як навука. Значэнне геаграфіі ў жыцці і гаспадарчай дзейнасці людзей.
3. Аналіз уплыву прыродных умоў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі краіны (на выбар).

### Білет № 2

1. Структура сферы паслуг Беларусі, яе роля ў эканоміцы. Геаграфія асобных відаў эканамічнай дзейнасці, якія ўтвараюць сферу паслуг. Геаграфія транспарту.
2. Паняцце аб літасферы. Будова зямной кары. Тэорыя літасферных пліт. Глабальныя формы рэльефу Зямлі. Асноўныя формы рэльефу сушы і дна Сусветнага акіяна.
3. Характарыстыка эканоміка-геаграфічнага становішча дзяржавы (на выбар).

### Білет № 3

1. Геаграфія металургіі Беларусі. Структура, фактары размяшчэння і геаграфія асноўных вытворчасцей.
2. Краіны Цэнтральнай Азіі: Казахстан, Узбекістан, Таджыкістан, Туркменістан, Кыргызстан. Агульная эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін рэгіёна.
3. Пабудова і аналіз ружы вятроў (па прапанаваных даных).

### Білет № 4

1. Геаграфія сельскай гаспадаркі Беларусі. Роля ў эканоміцы краіны. Геаграфія раслінаводства і жывёлагадоўлі.

2. Краіны Усходняй Азіі. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка Кітая, Японіі. Краіны Паўднёвай Азіі. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка Індыі. (На выбар).

3. Апісанне прыроднага комплексу сваёй мясцовасці (на выбар).

## Білет № 5

1. Геаграфія хімічнай прамысловасці Беларусі. Склад, сыравінная база, фактары размяшчэння. Развіццё і геаграфія хімічных вытворчасцей.

2. Паняцце аб біясферы і яе межах. Разнастайнасць жывых арганізмаў і асаблівасці іх размеркавання ў літасферы, гідрасферы, атмасферы. Геаграфічныя паясы і прыродныя зоны Зямлі.

3. Устанаўленне сувязі паміж будовай зямной кары, формамі рэльефу і карыснымі выкапнямі (тэрыторыя на выбар).

## Білет № 6

1. Фізіка-геаграфічнае раяніраванне Беларусі. Правінцыі, іх асаблівасці.

2. Палітычная карта свету. Суверэнныя дзяржавы і залежныя тэрыторыі. Тыпалогія краін па формах праўлення, палітыка-тэрытарыяльным уладкаванні.

3. Нанясенне на контурную карту аб’ектаў па зададзеных геаграфічных каардынатах.

## Білет № 7

1. Асноўныя геаэкалагічныя праблемы Беларусі і іх характарыстыка. Рэгіянальныя і лакальныя экалагічныя праблемы. Прыродаахоўныя тэрыторыі.

2. Афрыка. Геаграфічныя адкрыцці і даследаванні, фізіка-геаграфічная характарыстыка мацерыка. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін рэгіёна: Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Егіпет (на выбар).

3. Пабудова графіка ходу тэмпературы за пэўны перыяд і яго аналіз (па прапанаваных даных).

## Білет № 8

1. Геаграфія лясной гаспадаркі Беларусі. Структура і роля лясной гаспадаркі ў эканоміцы краіны. Геаграфія асноўных вытворчасцей. Геаграфія рыбалоўства.

2. Краіны Заходняй Азіі: Грузія, Арменія, Азербайджан. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін рэгіёна.

3. Характарыстыка геаграфічнага становішча мацерыка (на выбар).

Білет № 9

1. Геаграфія машынабудавання Беларусі. Структура, фактары размяшчэння і геаграфія машынабудаўнічых вытворчасцей.

2. Краіны Паўднёвай Еўропы. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка Італіі.

3. Вызначэнне па фізічнай карце максімальных і сярэдніх глыбінь акіянаў уздоўж паралелі (на выбар).

Білет № 10

1. Геаграфія электраэнергетыкі Беларусі. Фактары размяшчэння, умовы развіцця і геаграфія вытворчасці і размеркавання электраэнергіі.

2. Надвор’е і клімат. Кліматаўтваральныя фактары. Кліматычныя паясы Зямлі, кліматычныя вобласці і тыпы клімату.

3. Вызначэнне па статыстычных даных сярэдняй шчыльнасці насельніцтва краіны (на выбар).

Білет № 11

1. Нацыянальная эканоміка Беларусі. Сучасная структура. Фактары, якія абумоўліваюць размяшчэнне вытворчасці. Найважнейшыя сацыяльна-эканамічныя цэнтры краіны.

2. Аўстралія і Акіянія. Гісторыя адкрыцця і даследавання, асаблівасці прыроды. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін рэгіёна: Аўстралійскі Саюз, Новая Зеландыя (на выбар).

3. Вызначэнне па геаграфічнай карце адлегласцей паміж аб’ектамі (з дапамогай маштабу і градуснай сеткі).

Білет № 12

1. Насельніцтва Беларусі. Колькасць насельніцтва і яе дынаміка. Размяшчэнне насельніцтва. Структура насельніцтва. Унутраныя і знешнія міграцыі насельніцтва краіны. Працоўныя рэсурсы Беларусі.

2. Геаграфія сельскай гаспадаркі свету, яе галіновая структура і сувязь з прыроднымі ўмовамі. Склад і геаграфія раслінаводства і жывёлагадоўлі.

3. Аналіз кліматычных дыяграм (на выбар).

Білет № 13

1. Геаграфія лёгкай прамысловасці Беларусі. Фактары размяшчэння, сыравінная база, геаграфія вытворчасці прадукцыі. (На выбар).

2. Антарктыда. Гісторыя адкрыцця. Асаблівасці геаграфічнага становішча і прыродных умоў. Сучасныя даследаванні.

3. Вызначэнне напрамкаў на глобусе і карце.

Білет № 14

1. Знешнеэканамічныя сувязі Беларусі. Месца краіны ў міжнародным падзеле працы. Галоўныя эканамічныя партнёры Беларусі. Свабодныя эканамічныя зоны, сумесныя і замежныя прадпрыемствы на тэрыторыі Беларусі.

2. Паўднёвая Амерыка. Геаграфічнае становішча і асаблівасці прыроды. Палітычная карта, дэмаграфічныя асаблівасці, гаспадарка. Агульная эканоміка-геаграфічная характарыстыка Бразіліі.

3. Складанне комплекснай характарыстыкі сваёй мясцовасці па плану з выкарыстаннем карт атласа.

Білет № 15

1. Геаграфічныя даследаванні Беларусі. Сучасныя даследаванні. Роля геаграфіі ў вырашэнні сучасных гаспадарчых задач.

2. Краіны Паўночнай Еўропы. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін: Вялікабрытанія; Фінляндыя, Швецыя, Данія, Ісландыя, Нарвегія; Літва, Латвія, Эстонія (на выбар).

3. Апісанне па геаграфічнай карце асобных раўнін, горных краін (на выбар).

Білет № 16

1. Геаграфія горназдабыўнай прамысловасці Беларусі, яе склад, роля ў структуры гаспадаркі і паказчыкі развіцця. Геаграфія здабычы карысных выкапняў.

2. Краіны Усходняй Еўропы. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка Украіны, Польшчы (на выбар).

3. Складанне схемы структуры прамысловай вытворчасці.

Білет № 17

1. Глебы Беларусі. Фактары і працэсы глебаўтварэння. Асноўныя тыпы глеб, іх распаўсюджанне. Зямельныя рэсурсы і іх выкарыстанне. Меліярацыі глеб.

2. Еўразія. Геаграфічнае становішча, геаграфічныя адкрыцці і даследаванні мацерыка. Агульная характарыстыка прыроды мацерыка.

3. Выяўленне заканамернасцей размеркавання кліматычных паясоў і прыродных зон свету на прыкладзе аднаго з мацерыкоў.

Білет № 18

1. Рэльеф Беларусі, фактары фарміравання. Асноўныя формы рэльефу, іх размяшчэнне і характарыстыка. Уплыў дзейнасці чалавека на змяненне рэльефу.

2. Краіны Заходняй Еўропы. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка Францыі, Германіі (на выбар).

3. Вызначэнне азімутаў і напрамкаў па зададзеных азімутах з дапамогай компаса.

Білет № 19

1. Геаграфія харчовай прамысловасці Беларусі. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці харчовых прадуктаў.

2. Атмасфера, яе склад, будова і значэнне. Тэмпература паветра, атмасферны ціск, атмасферныя ападкі і іх размеркаванне на зямной паверхні. Кліматычныя паясы Зямлі.

3. Вызначэнне геаграфічных каардынат аб’екта.

Білет № 20

1. Клімат Беларусі. Фактары фарміравання клімату. Асноўныя рысы і паказчыкі клімату. Сезоны года і іх асаблівасці. Кліматычныя рэсурсы. Сучасныя змены клімату.

2. Геаграфія прамысловасці свету, яе прызначэнне і структура. Склад здабыўной і апрацоўчай прамысловасці. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка галіны прамысловасці (на выбар).

3. Вызначэнне абсалютнай і адноснай вышыні аб’ектаў на геаграфічнай карце.

Білет № 21

1. Паверхневыя воды Беларусі, іх значэнне і гаспадарчае выкарыстанне.

2. Паўночная Амерыка. Геаграфічнае становішча, геаграфічныя адкрыцці і даследаванні мацерыка. Агульная характарыстыка прыроды мацерыка.

3. Вызначэнне сярэдняй тэмпературы паветра і амплітуды тэмператур (за пэўны перыяд).

Білет № 22

1. Геалагічная будова і карысныя выкапні Беларусі. Найбуйнейшыя радовішчы карысных выкапняў.

2. Краіны Паўночнай Амерыкі. Агульная эканоміка-геаграфічная характарыстыка ЗША, Канады. Краіны Цэнтральнай Амерыкі. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка Мексікі. (На выбар).

3. Чытанне плана мясцовасці.

Білет № 23

1. Геаграфія нафтавай і нафтаперапрацоўчай, газаперапрацоўчай прамысловасці Беларусі. Фактары размяшчэння вытворчасці нафтапрадуктаў. Найбуйнейшыя нафтаправоды і цэнтры нафтаперапрацоўкі.

2. Расійская Федэрацыя. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краіны.

3. Геаграфічнае апісанне акіяна (на выбар).

Білет № 24

1. Раслінны і жывёльны свет Беларусі. Асноўныя тыпы расліннасці. Размяшчэнне і відавы склад флоры і фаўны. Гаспадарчае выкарыстанне і ахова расліннага і жывёльнага свету.

2. Гаспадарка і яе структура. Сферы, галіны, віды эканамічнай дзейнасці. Фактары размяшчэння гаспадаркі. Паняцце аб сусветным рынку, сусветным гандлі і сусветнай гаспадарцы.

3. Нанясенне на контурную карту геаграфічных аб’ектаў.

Білет № 25

1. Геаграфія вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у Беларусі. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці шкла і вырабаў з шкла, керамічных вырабаў, цэменту, вапны і гіпсу, вырабаў з бетону.

2. Гідрасфера Зямлі. Агульная характарыстыка Сусветнага акіяна. Воды сушы, паверхневыя і падземныя воды.

3. Аналіз паказчыкаў натуральнага прыросту насельніцтва дзвюх краін (на выбар).

Білет № 26

1. Геаграфія дрэваапрацоўчай, мэблевай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці Беларусі. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці.

2. Насельніцтва свету, колькасць насельніцтва і яе дынаміка. Размяшчэнне і шчыльнасць насельніцтва. Міграцыі насельніцтва. Расавы, этнічны і рэлігійны склад насельніцтва.

3. Вызначэнне геаграфічных карт па маштабе, ахопе тэрыторыі, змесце.